**А.С.Волкава,** *ст.выкладчык*

# ФАРМІРАВАННЕ ЎМЕННЯ ПЕРААДОЛЬВАЦЬ ЦЯЖКАСЦІ ЎСПРЫМАННЯ ДЫЯЛОГА

Жаданне падзяліцца атрыманай інфармацыяй, знайсці адказы на пытанні, узніклыя ў ходзе ўспрымання іншай мовы, прымушае ўключыцца ў дыялог.

Успрыманне і разуменне стымулюючага выказвання ў дыялогу – неабходная ўмова для ажыццяўлення адказнага выказвання на вызначаных моўных параметрах, гэта значыць з выкарыстаннем вызначанай канструкцыі або лексікі.

Працэс нараджэння і ўспрымання моўнага выказвання ў дыялогу характарызуюць матыў, мэта, камунікатыўны намер суразмоўцаў, іх погляды, асноўная форма выказвання думкі, аб'ект выказвання, яго асноўныя характарыстыкі і агульная думка выказвання. На гэта ў сваіх працах указваюць І.А.Зімняя, Т.В.Ахуціна, Я.М.Колкер.

Пад мэтай выказвання разумеецца імкненне дасягнуць пэўнага ўплыву на суразмоўцу: пераканаць яго, выклікаць тое ці іншае ўражанне, прымусіць задумацца і інш.

Матыў – гэта тая прычына, якая стымулюе суразмоўцаў дабівацца мэты. Адзін і той жа матыў можа рэалізоўвацца ў розных мэтах.

Камунікатыўны намер уяўляе свядома выбраную тактыку дасягнення мэты, абумоўленую як самой мэтай, так і камунікатыўнай сітуацыяй. Камунікатыўная сітуацыя ўключае ўмовы зносін і характарыстыкі ўдзельнікаў камунікацыі: іх інфармаванасць, сацыяльны статус, адносіны адзін да аднаго, настрой і інш.

Пункт гледжання разумеецца як прасторавы ракурс у апісанні.

Форма перадачы думкі вызначаецца мэтай суразмоўцаў, якія хочуць падзяліцца сваімі ўражаннямі аб статычным або дынамічным малюнку бачанага ў рэальнасці, растлумачыць паняцце,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для разнастайных ансамбляў, так і для аркестраў. Студэнты іграюць у ансамблі творы, якія яны інструментуюць пад кіраўніцтвам выкладчыка па інструментоўцы. Вучэбны ансамбль – гэта творчая лабараторыя, дзе студэнты вучацца практычным навыкам інструментоўкі. Павінна быць вельмі цесная сувязь выкладчыкаў па інструментоўцы з вучэбным ансамблем. Важны шлях для дасягнення эфектыўнасці і выніковасці вучэбнага працэсу можа быць наступны: выкладчык–кіраўнік ансамбля выкладае інструментоўку ў студэнтаў–удзельнікаў ансамбляў. Гэта дае магчымасць больш якасна працаваць з імі. У выніку студэнт рыхтуе да дзяржаўнага экзамену праграму па інструментальным ансамблі з твораў, якія інструментаваў для ансамбля. Такім чынам, кожны ўдзельнік ансамбля паказвае сябе ў якасці саліста-інструменталіста ў суправаджэнні ансамбля.

Вялікая роля выкладчыка і кіраўніка ансамбля ў падборы рэпертуару, вызначэнні складу ансамбля для выканання кожнага канкрэтнага твора. Падбор рэпертуару з'яўляецца адным з вырашальных фактараў у стымуляванні мастацкага і тэхнічнага росту ансамблевых выканаўцаў. Выкладчык павінен выкарыстоўваць усё багацце кампазітарскіх стыляў і жанраў, уключаць у вучэбны рэпертуар творы замежнай, у тым ліку рускай і беларускай класікі, а таксама лепшыя ўзоры народнай музыкі. Паслядоўнасць вывучэння твораў вызначаецца мастацкім і тэхнічным узроўнем падрыхтоўкі ўдзельнікаў ансамбля і перспектывамі іх творчага росту. Прадметна-метадычная камісія надае шмат увагі праблеме рэпертуару ва ўсіх вучэбных калектывах. Вельмі сур'ёзна абмяркоўваюцца выступленні з праграмамі на экзаменах, канцэртах, запрашаюцца выкладчыкі па інструментоўцы, спецінструменце, праводзіцца дэталёвы аналіз праграм і выканання з удзельнікамі ансамбля.

Прадметна-метадычная камісія пастаянна ўдасканальвае падрыхтоўку студэнтаў па спецыялізацыі "кіраўнік ансамбля". Шмат выпускнікоў паспяхова працуюць з творчымі калектывамі ў розных установах культуры.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

працэс, спосаб ажыццяўлення дзеяння, паказаць беспадстаўнасць чужога пункта гледжання і сфарміраваць новы (палеміка). У названых сітуацыях выкарыстоўваюцца апісанне, тлумачэнне, палеміка. Існуюць і такія формы выказвання думкі, як каменціраванне, высвятленне, удакладненне дэталяў існуючага і інш.

Аб'ектам выказвання з'яўляецца асноўная прымета прадмета або дзеяння, аб якім ідзе гаворка. Выбар аб'екта выказвання вызначаецца мэтай і камунікатыўным намерам суразмоўцаў. Асноўныя характарыстыкі аб'екта выказвання – гэта найбольш характэрныя яго прыметы, размешчаныя ў вызначанай паслядоўнасці.

Калі гаварыць аб спосабах дэталізацыі думкі, то асноўнымі з іх з'яўляюцца наступныя: пералічэнне, паслядоўнасць у часе і прасторы, азначэнне, класіфікацыя, супастаўленне. Яны выступаюць як адзінкі матывацыйна-стымуляванага комплексу, і іх патрэбна выкарыстоўваць для развіцця аўдытыўных з'яў.

На першым этапе фарміравання ўмення пераадольваць цяжкасці ва ўспрыманні дыялога неабходна навучыць студэнтаў арыентавацца ў агульным змесце ўспрымаемага на слых дыялога. Перш за ўсё трэба знайсці ў дыялогу моўныя сродкі, якія складаюць яго аснову. Важна вызначыць настрой суразмоўцы, які пачынае дыялог, і яго камунікатыўны намер.

Другі этап прадугледжвае фарміраванне ўмення звяртаць увагу на моўныя сродкі, якія звязваюць у дыялогу папярэднюю думку з наступнай, могуць адначасова служыць для пераходу да наступнай праблемы і нават да змянення аб'екта выказвання. Уменне знаходзіць у праслуханым дыялогу сведчанне аб тым, што суразмоўцы зацікаўлены ў яго працягу, палягчае задачу сачыць за лагічным развіццём успрымаемай на слых размовы. Але перш за ўсё гэта ўменне важна як сродак для развіцця рэпрадуктыўнага ўмення звязваць сваю рэпліку з папярэдняй рэплікай суразмоўцы.

Наступнае ўменне, якое неабходна сфарміраваць у студэнтаў, – гэта ўменне прагназаваць развіццё рэплікі суразмоўцы ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адказ. Перш за ўсё неабходна сфарміраваць здольнасць угадваць наперад, як ініцыятыўная рэпліка можа ўздзейнічаць на суразмоўцу, і ў сувязі з гэтым планаваць сваю наступную рэпліку.

Адзначым яшчэ адно неабходнае ўменне – удасканальваць камунікатыўны намер суразмоўцы, які прагназаваўся на аснове ўласнай ініцыятыўнай рэплікі і пачатку рэплікі ў адказ. Па пачатку рэплікі ў адказ адзін з суразмоўцаў зразумее настрой другога і яго адносіны да сітуацыі, а канец рэплікі дае магчымасць зразумець, ці быў прагноз правільным.

І апошняе – фарміраванне ў суразмоўцаў здольнасці бачыць, ці ёсць логіка ў думках таварыша, і разумець галоўнае ў яго пункце гледжання ў канцы дыялога, аб'яднаць выказанае ім у адным сказе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ